# АНАЛІЗ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАГРАФІЧНАЙ СІТУАЦЫІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАВОДЛЕ ПОЛЬСКАГА ПЕРАПІСУ 1931 ГОДА

***В. Э. Рабышка****, дацэнт Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці*

У Заходняй Беларусі, якая паводле Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. была ўключана ў склад Польшчы, у снежні 1931 г. быў праведзены другі перапіс насельніцтва (першы — у 1921 г.). Для вызначэння нацыянальнасці быў уведзены моўны крытэрый. Ён быў больш выгадны для польскіх улад, якія імкнуліся падкрэсліць, што пераважную большасць насельніцтва «усходніх крэсаў» складаюць палякі. Польская мова, дзякуючы асноўным накірункам дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, дастаткова трывала ўкаранялася ва ўсе сферы жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі. Польскія ўлады меркавалі, што гэта падштурхне значную колькасць насельніцтва назваць менавіта польскую мову ў якасці сваёй роднай. Фармуляры для перапісу былі адрэдагаваныя не толькі па-польску, але таксама на мовах нацыянальных меншасцей, у тым ліку і на беларускай. Сярод тых, хто праводзіў падлікі, былі таксама шматлікія прадстаўнікі няпольскай нацыі. На жаль, канчатковыя вынікі не паказалі ўсёй рэальнай сітуацыі. Шматлікія беларусы, яўрэі і ўкраінцы, якія ведалі польскую мову, назвалі яе з розных прычынаў у якасці сваёй роднай. Пераважная частка насельніцтва, што жыла на Палессі і размаўляла на пераходных дыялектах, не была ў стане акрэсліцца ў мове і падала ў якасці роднай мовы так званую «тутэйшую».

Афіцыйныя вынікі перапісу паказалі ў прынятых да аналізу 28 паветах 4 005 тыс. жыхароў. У адносінах да перапісу 1921 года зафіксаваны вельмі выразны ўзрост лічбы насельніцтва — да 723,7 тыс. асобаў. На тое было некалькі прычын. З аднаго боку, меўся высокі натуральны прырост, звязаны з пасляваеннай кампенсацыяй народзінаў. Непасрэдна пасля вайны працягвалася

рэпатрыяцыя насельніцтва з усходу. Яна таксама ўплывала на павялічэнне насельніцтва, у тым ліку на лічбы беларускіх жыхароў, а таксама на працэнтныя суадносіны ў агульнай структуры насельнікаў Заходняй Беларусі. Адбылося гэта дзякуючы прыбыццю ў Польшчу 489,2 тыс. рэпатрыянтаў [1]. Так, у Палескім ваяводстве агульная колькасць рэпатрыянтаў за 1921-1924 гг. склала 134,3 тыс чалавек [2]. Пры аналізе нацыянальнай структуры трэба браць пад увагу змену крытэрыя. Замест нацыянальнасці, як было ў 1921 г., у перапісу 1931 г. пытанне ставілася пра родную мову. Усе гэта разам паўплывала на пэўную статыстычную непараўнальнасць. Лічба асобаў беларускай нацыянальнасці павялічылася згодна з данымі афіцыйнай статыстыкі з 1 171,6 тыс. да 1 613 тыс. асобаў (з 26,6 % да 40 %), якія прызнавалі беларускую мову, польскай нацыянальнасці — з 1 732 тыс. да 1 849 тыс, пры памяншэнні працэнтнага ўдзелу з 52,8 % да 46 %. Змянілася ў бок павелічэння колькасць яўрэйскага насельніцтва (з 268,4 тыс. да 299 тыс).

Апублікаваныя вынікі перапісу паводле моўнага крытэрыю паказвалі на тры паветы, дзе палякі выразна пераважалі (Шчучын — 83,5 %, Ашмяны — 81,3 %, Ліда — 79,3 %). Яшчэ ў двух паветах польскамоўнае насельніцтва дасягала 2/3 насельніцтва (Валожын — 66,5 %, Браслаў — 65,6 %) [3; 4]. У некалькіх паветах існавала перавага палякаў ці раўнавага паміж польскім і беларускім насельніцтвам. Гэтыя паветы належылі да Віленскага, Навагрудскага і Беластоцкага ваяводстваў. У той самы час ва ўсім Палескім ваяводстве значна пераважала беларускамоўнае насельніцтва (разам з так званай «тутэйшай» мовай). Рускамоўнага насельніцтва было няшмат. Галоўным чынам гэта былі так званыя старaабрадцы (напрыклад, у павеце Браслаў і Дзісна). Значную групу нацыянальнай меншасці складалі жыхары, якія ўжывалі яўрэйскую мову. У паўднёвай частцы на мяжы з Валынскім ваяводствам частка насельніцтва (у Брэсцкім павеце — 17,9 тыс і ў Кобрынскім павеце — 21,9 тыс) падала ўкраінскую мову. У перапісу, праведзеным у 1897 г., амаль усе праваслаўнае насельніцтва ў гэтых двух паветах называла

украінскую мову. Гэта сведчыць пра эвалюцыю свядомасці і ўсе больш выразную ідэнтыфікацыю насельніцтва ў бок беларускай, а не ўкраінскай нацыі.

Інтэрпрэтацыя вынікаў польскага перапісу 1931 г. выявіла, што прымяненне моўнага крытэрыю паўплывала на павялічэнне лічбы насельнікаў, якія карысталіся польскай мовай. Шмат людзей няправільна паказала на польскаю мову як сваю родную, жадаючы прадэманстраваць лаяльнасць да польскай дзяржавы ці асцерагаючыся дыскрымінацыі. Звычайна на гэтых тэрыторыях знаёмства з польскай мовай не было грунтоўна замацавана. У такой сітуацыі высокі паказальнік польскамоўнага насельніцтва з'явіўся істотным фактарам фальсіфікацыі рэчаіснасці. Увядзенне польскай школы, якой аддавала перавагу каталіцкае насельніцтва, і набор маладых мужчын у польскае войска пашыралі сферу польскай мовы. Узрастаў працэнт двухмоўнага насельніцтва, якое ўжывала ў касцеле і горадзе польскую мову, а ў сям'і — «тутэйшую». Малодшая генерацыя прымала польскую мову, трактуючы яе як сацыяльна больш высокую.

Нягледзячы на працяг працэсу паланізацыі малодшага пакалення, на сельскіх абшарах далека ад гарадоў па-ранейшаму пабытовай мовай была беларуская. У той самы час паблізу гарадоў, асабліва ў раёне Вільні ішоў працэс заняпаду «тутэйшай» мовы на карысць польскай. Прыхільнікі каталіцкай веры, якія «пасіўна» ведалі польскаю мову з касцела, прымалі яе спантанна. У сваю чаргу, праваслаўнае насельніцтва мела польскую мову за чужую і было звязанае з беларускай культурай і мовай. Па-ранейшаму веравызнанне, а не мова, было дамінантным элементам у фарміраванні свядомасці.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі жыло 1 942,8 тыс. асобаў праваслаўнай веры і 1 658,5 тыс. прыхільнікаў рымска-каталіцкага касцелу. Прыхільнікі іўдаізму складалі 335,6 тыс. чалавек. У тым, што ўжываюць польскую мову, прызналася 1 849 тыс. жыхароў. У той самы час толькі 1 658,5 тыс. чалавекаў належылі да рымска-каталіцкага веравызнання. Калі дапусціць,

што ўсе католікі былі палякамі (а гэта таксама не адпавядае рэчаіснасці), то да польскамоўнай групы яшчэ належала б залічыць 190,5 тыс. асобаў некаталіцкае веры, сярод якіх арыентацыйна вызначаецца 36,6 тыс. прыхільнікаў майсеевай рэлігіі і 153,9 тыс. праваслаўных вернікаў. Такое становішча цалкам было непраўдападобнае. Гэта можна праілюстраваць на прыкладзе Навагрудскага ваяводства. Лічба насельніцтва ваяводства паводле перапісу складала 1 057,1 тыс. чалавек, з іх 553,8 тыс. падало польскую мову ў якасці роднай, што давала 52,4 % ад усіх жыхароў. У той самы час насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання ў суме складала 40,2 % (424,6 тыс.) [5]. З гэтага вынікае, што амаль 130 тыс. жыхароў-некаталікоў (тут былі перш за ўсе праваслаўныя) падало ў якасці роднай мовы польскую. Не патрабуе ўдакладнення той факт, што сапраўдных палякаў сярод іх было няшмат. Гэта сведчыць пра тое, што моўны крытэрый не можа быць верагоднай падставай для ацэнкі нацыянальнай структуры. Праз гэта значна заніжалася лічба беларусаў.

Справа выглядае зусім інакш, калі ўзяць пад увагу крытэрый веравызнання. Шматлікія тагачасныя і пазнейшыя факты сведчаць, што статыстыка веравызнання з перапісу 1931 г. з’яўляецца больш адэкватнай рэчаіснасці, і таму яна ў пэўнай ступені можа быць падставай да вызначэння нацыянальнай структуры насельніцтва, што жыло на абшарах II Рэчы Паспалітай. Як і кожны крытэрый, які нешта замяняе, гэты таксама абцяжараны пэўнаю недакладнасцю, таму што як сярод католікоў былі беларусы, так і сярод праваслаўных, ды асабліва прыхільнікаў іўдаізму, былі асобы, якія свядома называлі польскую нацыянальнасць. Пэўная група католікаў (прыблізна 250 тыс. чалавек) [6] падалі падчас перапісу ў якасці сваёй роднай мовы беларускую. Гэтых асобаў не належыць залічваць да польскай нацыі.

Згодна з палажэннем, што толькі ў выпадку супадзення каталіцкай рэлігіі з дэкларацыяй польскай мовы ў якасці роднай, асобы, якія былі зафіксаваныя ў перапісе, траплялі да польскай

нацыянальнай групы. Адмінусаваныя ад лічбы вернікаў рымска-каталіцкага касцелу ўсе літоўцы (асноўная іх маса пражывала ў Віленскім ваяводстве і складала 66,8 тыс. чалавек, Наваградскім ваяводстве — 2,5 тыс. і Беластоцкім — 13,1 тыс. чалавек) і тыя католікі (беларусы), што прызналі за сваю родную мову няпольскую. Разам іх было каля 332,4 тыс. Астатняе каталіцкае насельніцтва ідэнтыфікавалася вельмі моцна з польскай нацыянальнасцю і дзяржаваю. Такім чынам, можна сказаць (але трэба ліцыць вельмі асцярожна), што сярод 1 658,5 тыс. католікоў было каля 1 326,1 тыс. палякаў. Да яўрэйскай нацыянальнасці неабходна аднесці ўсіх прыхільнікаў іўдзейскай рэлігіі — гэта недзе 335,6 тыс. Па моўным крытэрыі можна прызнаць колькасць расейцаў пад 81,7 тыс. Астатнія нацыянальныя меншасці (украінцы, літоўцы, татары) разам налічвалі 145,5 тыс. Калі адняць ад агульнай колькасці жыхароў усе названыя нацыянальнасці, можна вызначыць прыкладную колькасць беларусаў. У 1931 г. ўсяго іх было 2 116,1 тыс. Складалі яны 52,8 % ад агульнага насельніцтва. На другім месцы былі палякі — 1 326,1 тыс. (33,1 %), потым — яўрэі — 335,6 тыс. (8,4 %) і расейцы — 81,7 тыс. (2,0 %). Гэта прыкладныя лічбы, бо трэба ўлічваць той факт, што некаторая частка насельніцтва, якая па паходжанні з'яўлялася беларусамі, называла польскую мову ў якасці сваёй роднай па шэрагу названых вышэй прычын. Таму працэнт беларусаў на самой справе значна вышэй.

Цяжка выявіць дынаміку змен у нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі на працягу 10 гадоў паміж двума ўрадавымі перапісамі. Па-першае, абодва перапісы выкарыстоўвалі розныя крытэрыі ў вызначэнні этнічнай структуры насельніцтва: перапіс 1921 г. — крытэрый нацыянальнасці, перапіс 1931 г. — роднай мовы. Па-другое, трэба ўлічваць розныя палітычныя абставіны, у якіх праводзіліся перапісы. У 1921 г. Польшча ўключыла ў свой склад Заходнюю Беларусь. Імкнучыся даказаць легітымнасць сваіх дзеянняў з пункту гледжання этнічнага складу насельніцтва, польскія ўлады

пайшлі на фальсіфікацыю рэчаіснасці, значна скарачаючы пры падвядзенні вынікаў колькасць беларускага жыхарства. Адразу пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Польшчы улады пачалі праводзіць паланізатарскую і асімілятарскую палітыку ў адносінах да нацыянальных меншасцей, каб беларусы «думалі па-польску, вучыліся па-польску ў духу польскай дзяржаўнасці». Польская мова і культура пранікалі ва ўсе сферы жыцця, імкнучыся выцясніць усё беларускае. Працэс апалячвання, які ў 1930-я гг. набыў шырокі размах, не мог не адбіцца на нацыянальнай структуры насельніцтва заходнебеларускіх зямель і ў выніку прывёў да скарачэння працэнтнай колькасці беларускага насельніцва ў адносінах да прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці ў параўнанні з папярэднімі статыстычнымі данымі. Калі параўнаць зробленыя намі прыкладныя падлікі па асноўных нацыянальнасцях Заходняй Беларусі пасля аналізу двух польскіх перапісаў, то можна яскрава прасачыць выяўленую тэндэнцыю. У 1921 г. беларусы складалі 55,7 %, а ў 1931 г. — 52,8 %, палякі адпаведна 31,2 % і 33,1 %, яўрэі — 10,8 % і 8,4 %.

Польскі перапіс насельніцтва, праведзены ў 1931 г., быў адзіным у 30-я гг. Наступны павінен быў адбыцца ў 1941 г., аднак да яго справа не дайшла.

Такім чынам, аналіз вынікаў польскага перапісу 1931 г. выявіў далейшае развіццё асноўнай тэндэнцыі ў зменах нацыянальна-дэмаграфічнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі — працэнтнае скарачэнне колькасці беларусаў і павышэнне лічбы палякаў. Гэта было звязана з паступовым заканчэннем працэсу рэпатрыяцыі, вынікамі асімілятарскай і паланізатарскай палітыкі польскага ўрада і яшчэ раз пацвердзіла незавершанасць працэсаў фармавання нацыянальнай свядомасці ў некаторай часткі насельніцтва. Аднак, нягледзячы на выключна негатыўныя праявы некаторых этнапалітычных працэсаў, звязаныя з імкненнем польскай нацыі захаваць і замацаваць свае дамінантныя пазіцыі над тэрыторыяй Заходняй Беларусі, тут мелі месца і іншыя працэсы, якія, наадварот,

дапамагалі стрымліваць нарастанне названай вышэй тэндэнцыі. Гэта яскрава выявілася ў тым, што беларусы ў 30-я гг. XX ст. здолелі захаваць сваю нацыянальную адметнасць і на тэрыторыі Заходняй Беларусі складалі большасць — 52,8 % ад усёй колькасці насельніцтва.

### *Крыніцы і літаратура*


1. Эберхардт, П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897—1989 / П. Эберхардт. — Мн.: Бел. Фонд Сораса, 1997.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 1. — Воп. 2. — Спр. 1983.
3. Drugi powszechny spis ludnosci z dn. 9.XII.1931r. Wojewodstwo Wilenskie. Statystyka Polska. — Seria C. — Zeszyt 36. — Warszawa, 1936.
4. Drugi powszechny spis ludnosci z dn. 9. XII. 1931r. Statystyka Polska — Seria C. — Zeszyt 71. — Wojewodstwo Nowogrodzkie. — Warszawa, 1938.
5. Там жа, с. 23—24.
6. Tomaszewski, J. Robotnicy Bialopusini w latach 1919—1939 w Polsce / J. Tomaszewski // Acta Baltico-slavica. — T. 5. — Bialystok, 1967.